# Музейная гульня
# “Па краіне старадаўніх рэчаў“

**А. Л. Ленец,**
выкладчык беларускай мовы і літаратуры першай катэгорыі
Ваўкавыскага дзяржаўнага аграрнага каледжа.

Актуальнасць тэмы вызначаецца сучаснай сацыяльна-культурнай палітыкай. У цяперашніх умовах асаблівую значнасць набывае грамадзянска-патрыятычнае выхаванне юных грамадзян Рэспублікі Беларусь, развіццё духоўна-маральных каштоўнасцей, неабходнасць фарміравання высокіх маральна-этычных прынцыпаў навучэнцаў. Педагагічныя намаганні павінны быць скіраваны на тое, каб выхаваць чалавека творчага і таленавітага, які любіць сваіх родных, свой народ, Радзіму, сапраўднага грамадзяніна краіны. Для дасягнення эфектыўнасці неабходна не толькі даць веды і ўменні, якія садзейнічаюць фарміраванню адпаведных ідэалаў, прынцыпаў і светапогляду, але і развіваць неабходныя якасці асобы, духоўны свет навучэнцаў, шукаць новыя падыходы ў выхаванні падрастаючага пакалення. Паколькі ўсведамленне нацыянальнай ідэнтычнасці грунтуецца на паглыбленні гістарычнай памяці, то асаблівае значэнне набывае актуалізацыя гісторыка-культурнай спадчыны.

Роль і значэнне музеяў ўзрастае ў сувязі з неабходнасцю рэалізацыі дзяржаўнай праграмы па патрыятычнаму выхаванню моладзі. Правядзенне мерапрыемстваў на базе музеяў дазваляюць педагогам даць навучэнцам матывацыю да далейшага культурнага і творчага самаразвіцця асобы навучэнцаў.

Форма гульні-квэста дазваляе стварыць своеасаблівую творчую, эмацыянальную атмасферу, пры якой адбываецца шырокае ўзаемадзеянне ўдзельнікаў каманд адзін з адным, усе прысутныя навучэнцы аказваюцца ўцягнутымі ў гульнёвую дзейнасць. Такая форма мерапрыемства садзейнічае фарміраванню шэрагу кампетэнцый: навучальна-пазнавальнай, інфармацыйнай, лінгвістычнай, інтэлектуальнай, камунікатыўнай.

Дадзеная метадычная распрацоўка можа быць выкарыстана ў якасці дадатковага матэрыялу як на занятках па беларускай мове і літаратуры, гісторыі, так і куратарамі вучэбных груп, выхавацелямі інтэрнатаў пры правядзенні пазавучэбных мерапрыемстваў, педагогамі дадатковай адукацыі. Музейная гульня дае магчымасць навучэнцам праявіць сябе, свае веды, уменні, фантазію, творчасць, а многім – пашырыць свой кругагляд.

*Мэта:* арганізаваць гульнёвую  форму дзейнасці, якая садзейнічае развіццю пазнавальнай і творчай актыўнасці навучэнцаў.

*Задачы:*

- пазнаёміць з прадметамі старыны, іх прызначэннем у мінулым і каштоўнасцю  зараз;
- сістэматызаваць веды навучэнцаў пра традыцыі, абрады беларускага народа;
- садзейнічаць развіццю здольнасці да эстэтычнага успрыняцця, развіваць лагічнае мысленне, вобразнае ўспрыняцце гісторыі, нашага мінулага;
- садзейнічаць развіццю цікавасці да нацыянальнай культуры,   выхаванню беражлівых адносінаў да народных традыцыі;
- садзейнічаць фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці навучэнцаў праз знаёмства з традыцыямі беларускага народа;
- выхоўваць павагу і любоў да народнай спадчыны, мовы беларусаў; выхоўваць музейную культуру;
- выхоўваць любоў да малой радзімы, беражлівыя адносіны да прадметаў старыны.

*Форма правядзення*: квэст-гульня

*Месца правядзення*: этнаграфічны музей “Беларуская хатка”

*Абсталяванне:* экспазіцыя  этнаграфічнага  музея «Беларуская хатка», канверты з заданнямі, канверты з карткамі,  наглядны матэрыял.

Змест

Уступ

1. Квэст “Дзівосны свет скарбаў народных“
2. Аб’яўленне правілаў
3. Прадстаўленне каманд
4. Выкананне квэставых заданняў
5. Рэфлексія

***Вядучы 1.*** Спадчына! Якое простае слова і які няпросты яго сэнс!

Спадчына – гэта наша мінулае, наша памяць. Сапраўды, цяжка ўявіць сабе чалавека без гісторыі, без кроўных сувязей з роднай зямлёй,

без адчування сваіх вытокаў, без памяці, без роду і племені. Дык давайце ж пройдземся сцежкамі памяці беларускага народа, прыгадаем яго скарбы.

***Вядучы 2.*** А сустрэча ў нас незвычайная. Сёння мы з вамі прыадчынім дзверы ў дзівосны свет скарбаў народных, у свет нашай спадчыны.

Можа змяніцца час, дзяржава, людзі, але нязменнымі застаюцца сведкі даўно мінулых дзён – пісьмовыя дакументы, прылады працы, прадметы побыту жыхароў беларускіх зямель, нашых прабабуль і прадзядуль.

***Вядучы 1.*** Народныя абрады, звычаі, цяжкая сялянская праца – аб усім гэтым нам паведамляюць рэчы, якія яшчэ гадоў 40 таму можна было знайсці на гарышчы амаль кожнай сялянскай хаты. Цяпер яны сустракаюцца толькі на рынку ў гандляроў антыкварыятам або ў гістарычных, этнаграфічных, краязнаўчых музеях.

***Вядучы 2.*** Мы рады вас вітаць у нашым этнаграфічным музеі “Беларуская хатка” і хочам запрасіць у незвычайнае падарожжа – падарожжа ў мінулае нашага народа. Мы заглянем у хату беларускага селяніна, пазнаёмімся з многімі старажытнымі рэчамі, даведаемся пра іх гісторыю.

***Вядучы 1.*** Мы запрашаем вас паўдзельнічаць у музейным квэсце. Квэст – гэта гульня, у якой трэба добра падумаць, пашукаць падказкі і рашыць розныя задачы. Тэма нашай гульні “Дзівосны свет скарбаў народных “.

***Вядучы 2.*** А зараз я патлумачу правілы. За кожнае правільна выкананае заданне каманда атрымае картку са словамі ці словазлучэннямі, з якіх патрэбна будзе скласці выказванне. (Дадатак 1).

Пераможа каманда, якая хутчэй зможа скласці выказванне.

***Заданне 1.*** Вось зараз мы паглядзім, як вы ўважліва слухалі экскурсавода, ці запомнілі вы, для чаго выкарыстоўвалі вашы прабабулі прадметы, змешчаныя ў нашай экспазіцыі. Я буду называць прадметы, а вы знаходзіце іх і тлумачыце, для чаго яны служылі.

**Рубель** – выкарыстоўвалі для мыцця і прасавання бялізны.

**Печ** – была сродкам абагрэву хаты, гатавання ежы, а яшчэ на ёй спалі малыя дзеці і старыя.

**Пранік** – драўляны брусок для выбівання бялізны пад час прання. Пранік мае ручку і рабочую паверхню, якая звычайна была рабрыстаю (зубчатаю), але магла быць і гладкаю. Выкарыстоўваўся і для абівання лёну ды проса.

**Збан** – гліняны посуд з выцягнутым тулавам, пукатымі бакамі, звужаным горлам, дзюбай-літком і вушкам-ручкай.

**Бязмен,** або ручныя вагі, дазвалялі ўзважваць тавары, не выкарыстоўваючы гіры.

**Прас** – прылада для разгладжвання складак на тканіне.

**Патэфон** – апарат існаваў для таго, каб прайграваць вінілавыя пласцінкі. Мабільнасць гэтай версіі прайгравальніка забяспечвала тое, што ён быў скампанаваны як чамадан з ручкай, якая дазваляе пераносіць яго без асаблівай цяжкасці.

***Заданне 2.*** Удзельнікі гульні атрымліваюць канверты з тэкстамі загадак. Адгадваюць прадмет і знаходзяць  яго сярод экспанатаў музея. (Дадатак 2)

***Заданне 3.*** Что такое “ручнік”?  Знайдзіце яго ў музеі.  Раскажыце, што вы ведаеце пра ручнікі, як іх выкарыстоўвалі, ці выкарыстоўваюць зараз. (Дадатак 3)

***Заданне 4.*** Разгледзьце ўважліва здымак. Якія з прадметаў ёсць у нашым музеі? Назавіце іх. Для чаго яны выкарыстоўваліся? (Дадатак 4,5)

***Вядучы 1.*** А зараз віктарына “Стравы беларускай кухні”.  Беларусы славяцца сваёй гасціннасцю. Толькі госць на парог – пачастунак на стол. І паспрабуй тут нечага не пакаштаваць – гаспадыня пакрыўдзіцца…

**Віктарына**

1. Што такое талакно? (Спецыяльна прыгатаваная аўсяная мука.)
2. Рэдкая страва з дробных мучных камячкоў, згатаваная на вадзе або малацэ,  вядомая ў беларускай, рускай, літоўскай, украінскай і польскай кухнях . Пра пяць лыжак гэтай стравы напісаў апавяданне Змітрок Бядуля .  (Зацірка)
3. Як называецца посуд для прыгатавання цеста? (Дзяжа)
4. Сёння мы ведаем гэту страву як напой, а раней нашы продкі яго елі, наразаючы нажом. Пра што ідзе гаворка? (Кісель)
5. Што такое бігас? (Тушаная з мясам капуста.)
6. Паслухайце ўрывак з паэмы Якуба Коласа “Новая зямля”. Якое свята апісана? Якія стравы называюцца?

А на стале тым – рай, ды годзе,
Што рэдка трапіцца ў народзе,
Ляжала шынка, як кадушка,
Румяна-белая пампушка,
Чырвона зверху,сакаўная,
Як бы агонь у ёй палае,
А ніз бялюткі, паркалёвы;
Кілбасы-скруткі, як падковы,
Між сцёган, сала і грудзінак
Красуе ўсмажаны падсвінак,
Чысцюткі, свежы і румяны,
Як бы паніч той надзіманы.
Муштарда, хрэн – адно дзяржыся,
У рот паложыш – сцеражыся!

А пірагі, як сонца, ззялі,
І ў роце бабкі раставалі.
Са смакам елі і багата –
На тое ж даў Бог людзям свята! (Вялікдзень)

7. Страва са свежай рыбы з прыправамі, рыбная поліўка. Таксама бывае грыбная. (Юшка)

8. Страва, прыгатаваная з дранай бульбы і сала, запечаная ў печы.(Бабка)

9. Каша з цэлага абтоўчанага ячменю,запраўленая мёдам, арэхамі, разынкамі. Абрадавая яда на Каляды, Новы год. Бывае багатая і бедная. (Куцця)

І вось цяпер гаршчок з куццёю,
Як цар даўнейшаю парою,
Ў пачэсны кут, на свой прастол,
Стаўляўся з гонарам за стол
На гэта сена пад багамі,
Ўладар над хлебам і блінамі,
(Я.Колас. «Новая зямля» )

***Заданне 5.*** Адносіны беларусаў да ежы, застолля знайшлі сваё адлюстраванне ў прыказках і прымаўках. Мы зачытаем пачатак народных выслоўяў, а вы павінны іх закончыць.

- Дзе каша і аладка… (там будзе і грамадка).
- Будзе час…(будзе і квас).
- Як ем…(і глух, і нем).
- Чалавек галодны…(ні на што не годны).
- Смачна было…(ды блізка дно).
- Як зварыш…(так і з’ясі).
- На смачны кусочак…(знойдзецца раточак).
- Хлеб свежы…(смачны для ежы).
- Калі хлеб у возе…(то няма бяды ў дарозе).
- Вялікі кусок…(дзярэ раток).
- Госць, не дзьміся…(еш, што ў місе).
- Без капусты…(на стале пуста).

***Заданне 6.*** А зараз я са свайго куфэрка дастану некалькі рэчаў. Ці ведаеце вы, хто імі карыстаўся – гаспадар ці гаспадыня? Для чаго яны выкарыстоўваліся ў гаспадарцы? (вядучы дэманструе прадметы з сялянскага абіходу, навучэнцы расказваюць, як называецца прадмет і для чаго выкарыстоўваецца). (Дадатак 6)

***Заданне*** *7.* Зараз праверым, як вы ведаеце традыцыйнае беларускае адзенне. Вы павінны сабраць строй для жанчыны і для мужчыны. У вас ёсць карткі з назвамі адзення. Знайдзіце гэтыя рэчы ў нашым музеі.

*Картка 1.*

Фартух, спадніца, кашуля, хуста, каралі, лапці,

*Картка 2.*

Вушанка, кашуля, нагавіцы, камізэлька , анучы.

***Вядучы 1.*** Дзякуй за цікавую гульню. Відаць, што добра ведаюць нашы госці традыцыі і абрады нашых продкаў.

***Вядучы 2.*** Згодны з табою. Каманды, калі ласка, зачытайце выказванні,якія ў вас атрымаліся. Як вы разумееце іх сэнс?

***Вядучы 1.*** Ці ведаеце вы старажытную легенду аб беларусах? Не? Тады слухайце.

Бог дзяліў паміж народамі зямлі. Адным – тое, другім – тое.

Прыйшлі беларусы… Вельмі Богу спадабаліся. Ён і пачаў нас надзяляць:

"Рэкі вам даю поўныя, пушчы – нямераныя, азёры – нелічаныя. Жары ў вас ніколі не будзе, але і моцных маразоў – таксама. Галадаць вы ніколі не будзеце.

Не ўродзіць бульба, дык уродзіць жыта ці яшчэ што-небудзь. А яшчэ звяры і птушкі ў пушчах зграямі, рыба ў рэках – касякамі, пчолы ў вуллях – мільёнамі. А травы пахучыя – як чай. Не будзе голаду.

Жанчыны ў вас будуць прыгожыя, дзеці – моцныя, сады - багатыя, грыбоў і ягад – завалiся. Людзі вы будзеце таленавітыя, на музыку, песні, вершы – здольныя. І будзеце жыць ды жыць…"

***Вядучы 2.*** Жадаем вам шчасця, дабрабыту, плёну ў вашай справе, добрай вучобы. Чакаем запрашэння на новую сустрэчу.

***Выкладчык.*** Падводзячы вынікі, я хачу сказаць, пакуль жыве наша памяць, пакуль жыве наша культура – будзе жыць і квітнець наша Радзіма. Пакуль наша мінулае хвалюе нас і нам не абыякавыя падзеі дзён мінулых, мы жывем як нацыя, а значыць, мы моцныя духам і мы адзіныя. Без мінулага няма сучаснасці, а значыць і надзеі на будучае.

**Рэфлексія**

Сёння ў час гульні я даведаўся: (3 новых словы)

Сёння ў час гульні мне асабліва спадабаліся: (3 цікавыя рэчы)

Сёння ў час гульні мяне здзівілі: (3 унікальных прадмета)

Сёння ў час гульні мне запомніліся: (3 выразы ці прыказкі)

Дадатак 1

Добра быць коласам, але шчаслівы той, каму давялося быць васільком. Бо нашто каласы, калі няма васількоў? (Максім Багдановіч)

"Няма ў чалавека нічога прыгажэй і даражэй за радзіму. Чалавек без радзімы − бедны чалавек" (Колас)

Дадатак 2

Каля адной ямы ўсе з кіямі.(Міска і людзі з лыжкамі.)

Без кліноў, без капытоў, само падыходзіць, ніхто яго не трывожыць.(Цеста)

У кутку барада на кійку. (Мятла)

Напіўся, наеўся, на агонь усеўся.
Кашу зварыў і нас накарміў. (Гаршок)
Вузкі, быццам веташок,
Ен травы нажне мяшок,
А калісьці ў полі дбайна
Жыта жаў замест камбайна. (Серп)

Пад адной страхой чатыры браты стаяць. (Вуглы хаты)

Зверху голы, знізу лахматы, цяплом багаты. (Кажух)

Яна галодная-хата халодная,
Яна пад'ела – у хаце пацяплела. (Печ)

Бярвёны абчэша, палена расколе,
Сама не імкнецца, як іншы, да славы,
Стаіць сабе ціха ў куточку за лавай. (Сякера)

Два браты ўцякаюць, а два-даганяюць,
Але пярэднія не могуць уцячы, а заднія –дагнаць. (Колы)

І са звонам, і са спевам уразаецца ў дрэва,
раз – наперад, раз – назад,
Зубы ззяюць і апілкі ўніз ляцяць. (Піла)

Білі мяне, білі, білі, калацілі,
на кавалкі рвалі, па полі цягалі,
на ключ замыкалі і на стол паклалі. (Абрус)

Чорный конь скача ў агонь. (Качарга)

Плыве паром, вугаль у ём. (Прас)

Гэты абутак  не забылі, хоць даўным-даўно насілі.
Залезуць дзеці на палаці, каля печы паставяць. (Лапці)

Дадатак 3

***"Сімвалічная роля ручніка ў беларускіх абрадах"***

Ручнікі не толькі ўпрыгожвалі інтэр'ер хаты, але і шырока выкарыстоўваліся ў беларускіх абрадах. На вяселлі хлебам-соллю на ручніку сустракалі маладых пасля вянчання ў царкве. Ужываўся ручнік і ў якасці падножніка, на які станавіліся маладыя ў час вянчання. Адыходзячы ад аналоя, нявеста старалася цягнуць за сабой і ручнік. Гэта рабілася для таго, каб сяброўкі цягнуліся за ёю, выходзілі замуж. Самых паважаных гасцей падчас урачыстасцей і зараз сустракаюць хлебам-соллю на прыгожых ручніках.

У залежнасці ад прызначэння і функцый ручнікі маюць розныя назвы. Ручнікі ўтылітарныя паўсюдна на Беларусі называюцца ўціральнік, уцірач, уцірка. Іх выкарыстоўвалі для побытавых патрэб (выцíралі рукі і твар). Прычым на патрэбу сям'і выдзяляецца толькі адзі ручнік, які звычайна вісеў на сцяне. У лазню яго не бралі.Самым высокім статусам надзяляюцца абрадавыя ручнікі, багата аздобленыя вышыўкай, карункамі. Абрадавыя ручнікі выкарыстоўвалі ў святах і абрадах. Яны ўпрыгожваліся арнаментальный вышыўкай з кветак, геаметрычных сімвалаў і чароўных птушак.

Ручнікі мелі вялікі сімвалічны сэнс. Напрыклад, ручнікі, якія вешаліся на абразы, мелі сімвалічную сувязь з боскім святлом, з небам, са святлом Сонца звязваліся ручнікі, якія часам у рытуальных мэтах вешаліся на вокны. Існавала сімвалічная сувязь ручнікоў з зямлёй – на іх узорах пераважаў ромб, які ў старажытнай славянскай сімволіцы ўвасабляў зямлю, урадлівую глебу. Пра гэта гаворыць і рытуальнае выкарыстанне ручніка разам з хлебам. Хлеб як сімвал урадлівасці, багацця, выступаючы " ў тандэме" з ручніком, указваў не тое, што і ручнік мае сімволіку, звязаную з багаццем, шчасцем, урадлівай глебай.

Ручнікі мелі і яшчэ адно сімвалічнае значэнне. У некаторых раёнах Беларусі пры пахаванні нябожчыка адзін канец ручніка прыбівалі да века труны, а другі замацоўвалі на магільным крыжы, што сімвалізавала дарогу нябожчыка з гэтага свету ў іншы свет. Словам " дарога" называлі беларусы і ручнік, што прыбівалі ўздоўж сцяны, каля якой на лаве ляжаў нябожчык.

Такім чынам, ручнік сімвалізаваў дарогу, якая звязвала зямное жыццё з замагільным светам.

Дадатак 4



Дадатак 5



Дадатак 6

**Лапці** – традыцыйны сялянскі абутак, плецены з лыка (лазовага, ліпавага), пяньковых або льняных вітушак ці тонкіх вяровак. У мэтах надання трываласці падэшву лапцей падплятаалі лазой, вяроўкамі і падшывалі скурай.

**Сякера** – працоўная прылада, прызначаная для рубання і цясання.

**Серп** – прылада для зрэзвання злакаў і траў, складаецца з закругленага ляза (як правіла сталёвага) і кароткай драўлянай ручкі.

**Ліхтар** – пераносная ці стацыянарная штучная крыніца святла.

**Маслабойка**, або **бойка** – бандарны выраб; у беларусаў і іншых славянскіх народаў пасудзіна для збівання масла.

**Кола** – прыстасаванне ў выглядзе дыска ці вобада са спіцамі, насаджанага на вось; адзін з асноўных элементаў наземных транспартных сродкаў.

**Качарга** – жалезны прут, сагнуты на канцы, для перамешвання паліва ў печы, выграбання попелу.

**Вілкі** – доўгая драўляная ручка з двума металічнымі паўкруглымі рагамі на канцы; пры дапамозе гэтай прылады ставяць у печ і вымаюць з печы гаршкі, чыгункі.